# *Пахвала Вітаўту*

*Панегірычны твор 1430 г.*




*1. Князь вялікі Вітаўт*
*Вітаўт княства дзержаў*
*Літоўскае і Рускае*
*І іныя землі многіе*

*2. У той час Вітаўт прызваў*
*Вітаўт к себе прызваў*
*Караля Якгейла Польскага*
*Ды і Цэзара Рымскага*

*3. І князя маскоўскага*
*Караля угерскага*
*Князя велікага цверскага*
*І паслы князя рэзанскага*

*4. Містра прускага*
*Прускага інфлянскага*
*І паслы ад іншыя землі*
*Ды вялікія паслы былі*

*5. І ардынскія паслы*
*Влахаў ваеводы*
*Ад Вяліка Новагорада*
*І прыйшлі паслы ад Пскова*

*6. І ўсі тыя госці*
*Ў князя мешкалі*
*Тагды Цэзар Рымскі*
*З Вітаўтам у міласці былі*

*Copyright © Stary Olsa*

*7. І у Луцку Вітаўт*
*Тыя госці частаваў*
*Дараваў размаітымі*
*Дарамі каштоўнымі*

*8. Веліка гаспадара*
*Вітаўта слаўнага*
*Іж не можэць выпісаці*
*І о дарэх і о чэсці*

*9. Землі на вастоцэ*
*Або і на западзе*
*Кланяліся землі князю*
*Веліkаму князю Вітаўту*

*10. Ды цары турэцкі*
*І царагародскі*
*Былі ў ласцэ з Вітаўтам*
*З сільным ды гаспадарам*

*11. Каралеўства Чэскае*
*Ўгорскае і Польскае*
*Тэж дзержалі чэсць вяліку*
*Слаўну гаспадару Вітаўту*

*12. І быў Вітаўт сільны*
*Па ўсім землям слаўны*
*І цары і многія князі*
*У двару его служылі.*

*Copyright © Stary Olsa*